# Уладзімірская царква

*Калнін, В.В. Уладзімірская царква / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 124-127.*



Праваслаўныя храмы, перарobленыя з іншых ці ўзведзеныя нанова ў пазамінулым стагоддзі, не захаваліся, акрамя адной сціплай цэркаўкі з цаглянымі фасадамі, пабудаванай ў 1896 годзе. Яна размешчана ў Занёманскай частцы Гродна на вуліцы Перамогі, былой Індурскай. Зараз вуліца ўзнялася над чыгуначным палатном і царква апынулася пад схілам пуцеправода. Калісьці тут быў адкрыты пераезд і царква добра віднелася з Індурскай шашы і вакон прыватных драўляных дамоў блізкага наваколля.

Успамінаецца адзін веснавы вечар саракагадовай даўнасці. Я быў у сяброў, якія жылі ў драўляным дамку паблізу П’янага Вугла (так тады называлася перакрыжаванне галоўных вуліц Занёмання). Мы сядзелі на прызбе, западала цемра. Раптам у гэтай цемры засвяцілася мноства агеньчыкаў, спачатку струменем, потым пачалі расцякацца па баках. Гэта вернікі разносілі палаючыя свечкі з Уладзімірскай царквы па хатах.

Нядаўна папрасіў сябра ўспомніць гэты выпадак і даць тлумачэнне з’яве. Вось вытрымкі з яго ліста:

«Не адразу высветліў справу з агеньчыкамі, якія некалі разам назіралі. Як ні дзіўна, нованабытыя Царквою вернікі з інтэлігентаў не

толькі не маглі даць тлумачэнняў, але спрабавалі пераканаць, што нічога такога не існуе, што, калі існуе, то не ў Праваслаўі. Але ж я добра ведаў, што не блытаю. Зайшоў дзеля кансультацыі ў царкву і ўдакладніў: "У Вялікі Чацвер (тыдзень перад Вялікаднем) пасля чытання Евангелля вернікі не тушаць свечкі і нясуць іх запаленымі дадому".

У некага з расейскіх мастакоў (19-га стагоддзя, магчыма, з "перасоўнікаў") ёсць малюнак ці карціна (я аглядаў рэпрадукцыю), дзе малая дзяўчынка беражліва нясе запаленую свечку. Вельмі ўдала пададзены тварык малой, асветлены полымем. Адначасна друкаваўся верш пра гэты абрад. З усяго верша памятаю толькі словы "несут... свечечки".

Пазней ад тых жа сяброў прыйшло дадатковае тлумачэнне, дадзенае руплівымі вернікамі:

"Служба Великой Пятницы посвящена поминанию крестных страданий Спасителя, Его смерти и погребения. На утрени, которая служится в Великий Четверг, посреди храма читаются Двенадцать Страстных Евангелий. В это время все верующие стоят с зажженными свечами, показывая этим, с одной стороны, что слава и величие не оставили Господа и во время Его страданий, с другой стороны - горячую любовь ко своему Спасителю. Также свеча - это символ молитвы. Кроме молитвы церковной есть и молитва домашняя (келейная). Поэтому верующие берут свечи домой в продолжение молитвы, зажигают дома и молятся. Обычай нести из храма незагашенную свечу более поздний и может свидетельствовать о непрерывающейся молитве. Но, по словам священников, это не принципиально. Как сказал один батюшка, он тоже в свое время нес домой свечу зажженную, смотрел только на нее, чтоб не угасла, споткнулся, упал и разбил лоб".

